ПАДЗЕЯ




# КОНКУРС ІМЯ М. БАГДАНОВІЧА: ВЫНІКІ І ПЕРАМОЖЦЫ

**У Гродне ўзнагародзілі пераможцаў Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча.**

Імі сталі: член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Андрэй Татур (намінацыя «Паэзія»); член СПБ, празаік Таццяна Лашук (намінацыя «Проза»); член СПБ, паэтэса Тамара Мазур (намінацыя «Дзіцячая літаратура»); паэтэса Юлія Раманюк (Юлія Мельнік) перамагла ў намінацыі «Адкрыццё года». У намінацыях «Драматургія», а таксама «Публіцыстыка і краязнаўства», «Літаратуразнаўства і крытыка» конкурс не адбыўся.

Абвешчаны летась Абласны літаратурны конкурс імя М. Багдановіча па сваім фармаце – конкурс рукапісаў. Яго пераможцы атрымліваюць грашовую прэмію Гродзенскага аблвыканкама ў памеры 100 базавых велічынь, якая дае магчымасць выдання новых кніг. Творчае спаборніцтва літаратараў Гродзеншчыны арганізавана ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта. Узнагароджанне лаўрэатаў конкурсу адбылося 3 ліпеня 2024 года ў абласным цэнтры на ўрачыстым мітынгу ў гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Выданне кніг пераможцаў запланавана на бягучы 2024 год. Больш падрабязная інфармацыя пра новыя творы і выданні, якія дзякуючы абласному літаратурнаму конкурсу з’явяцца ў кніжнай скарбонцы нашага краю, будзе паведамляцца пазней.

Ад імя калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сардэчна віншуем пераможцаў Абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча: Андрэя Татура, Таццяну Лашук, Тамару Мазур і Юлію Раманюк з поспехам. Жадаем калегам моцнага здароўя, натхнення і новых перамог у галіне літаратурнага мастацтва.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На здымках:** пераможцы Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча Тамара Мазур, Таццяна Лашук, Юлія Раманюк, Андрэй Татур і губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Сцяпанавіч Каранік. Гродна, 3 ліпеня 2024 года.


ДЫПЛОМ
www.grodnonews.by


ДЫПЛОМ



Дыплом пераможцы з рук губернатара Гродзенскай вобласці У. С. Караніка атрымала лаўрэат Абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча ў намінацыі «Адкрыццё года», паэтэса Юлія Раманюк (Юлія Мельнік)



Пераможцы Абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча і старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч




**Таццяна Лашук, Андрэй Татур, Юлія Раманюк, Тамара Мазур**

*Выкарыстаны фота з адкрытых крыніц*